Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Першы прарэктар БДУКМ
___________ Н. У. Карчэўская
«___»_________ 2018 г.
Рэгістрацыйны № ____

# ПРАГРАМА
# ВУЧЭБНАЙ І ВЫТВОРЧАЙ ПРАКТЫКІ

***Для спецыяльнасці***
*1-17 03 01 Мастацтва эстрады (па напрамках),*
***напрамку спецыяльнасці***
*1-17 03 01-04 Мастацтва эстрады (рэжысура)*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2018

**СКЛАДАЛЬНІКІ:**
*Ю. Д. Персіцкая,* дацэнт кафедры рэжысуры эстрады, кандыдат мастацтвазнаўства;
*І. У. Яфрэмава,* дацэнт кафедры рэжысуры эстрады, кандыдат мастацтвазнаўства

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**
*кафедрай* рэжысуры эстрады ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол ад 01.02.2018 г. № 6);
*саветам* факультэта музычнага мастацтва ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол ад 26.02.2018 г. № 6)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адказны за рэдакцыю: В. Б. Кудласевіч
Адказны за выпуск: І. У. Яфрэмава

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Праграма вучэбнай і вытворчай практыкі па напрамку спецыяльнасці «мастацтва эстрады (рэжысура)» распрацавана ў адпаведнасці з адукацыйным стандартам вышэйшай адукацыі ОСВО 1-17 03 01-2013, Палажэннем аб практыцы студэнтаў, курсантаў, слухачоў, зацверджаным пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 3 чэрвеня 2010 г. № 860, Інструкцыяй аб парадку і асаблівасцях праходжання практыкі студэнтамі, якім пасля завяршэння навучання прысвойваюцца педагагічныя кваліфікацыі, зацверджанай пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 20 сакавіка 2012 г. № 24, вучэбным планам па спецыяльнасці 1-17 03 01 Мастацтва эстрады (па напрамках), напрамку спецыяльнасці 1-17 03 01-04 Мастацтва эстрады (рэжысура).

Практыка (азнаямленчая, рэпетыцыйна-канцэртная, педагагічная, пераддыпломная) з'яўляецца часткай адукацыйнага працэсу падрыхтоўкі спецыялістаў, працягам вучэбнага працэсу ў вытворчых умовах і праводзіцца ва ўстановах і арганізацыях культуры. Практыка накіравана на замацаванне ў вытворчых умовах ведаў і ўменняў, атрыманых у працэсе навучання ва УВА, авалоданне навыкамі рашэння сацыяльна-прафесійных задач, вытворчымі тэхналогіямі. Практыка арганізуецца з улікам будучай спецыяльнасці і спецыялізацыі.

Вучэбная (азнаямленчая) практыка праходзіць у 3 семестры (1 тыдзень, 54 гадзіны);

вытворчая (рэпетыцыйна-канцэртная) практыка праходзіць у 5 семестры (2 тыдні, 108 гадзін);

вытворчая (педагагічная) практыка праходзіць у 5, 6 семестрах (2 тыдні, 108 гадзін);

вытворчая (пераддыпломная) практыка праходзіць у 7, 8 семестрах (4 тыдні, 216 гадзін).

Дадзеная праграма акрэслівае змест практыкі для ўсяго тэрміну навучання; уключае бібліяграфічны спіс, які дапаможа ў пошуку і самастойным вырашэнні праблемных пытанняў, а таксама метадычных рэкамендацый, што тычацца азнаямленчай, рэпетыцыйна-канцэртнай і пераддыпломнай практыкі; планы выканання практычных заданняў педагагічнай практыкі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Праграма вызначае мэты і задачы практыкі, змест арганізацыі і кіраўніцтва практыкай, абавязкі студэнтаў-практыкантаў і кіраўнікоў практыкі, парадак падвядзення вынікаў. Структура праграмы распрацавана ў адпаведнасці з агульнымі кірункамі азнаямлення, сістэматызацыі, пашырэння і паглыблення навыкаў, уменняў, ведаў студэнтаў у галіне сучасных падыходаў да пастаноўкі відовішчных мерапрыемстваў і дзействаў, арганізацыі педагагічнага працэсу выкладання спецыяльных дысцыплін ва ўстановах культуры і ўстановах адукацыі ў галіне культуры.

Суадносна з адукацыйным стандартам вышэйшай адукацыі ОСВО–2013 па спецыяльнасці 1-17 03 01 Мастацтва эстрады (по напрамках) у працэсе выканання практычнага навучання ў межах розных яго відаў студэнт павінен авалодаць акадэмічнымі, сацыяльна-асобаснымі і прафесійнымі кампетэнцыямі.

**Азнаямленчая (вучэбная) практыка**

***Акадэмічныя кампетэнцыі:***

АК-1. Умець выкарыстоўваць базавыя навукова-тэарэтычныя веды для вырашэння тэарэтычных і практычных задач.

АК-2. Валодаць сістэмным і параўнальным аналізам.

АК-8. Валодаць навыкамі вуснай і пісьмовай камунікацыі.

***Сацыяльна-асобасныя кампетэнцыі:***

САК-1. Валодаць якасцямі грамадзянскасці.

САК-2. Быць здольным да сацыяльнага ўзаемадзеяння.

САК-3. Валодаць здольнасцю да міжасобасных камунікацый.

***Прафесійныя кампетэнцыі:***

ПК-5. Фарміраваць мастацкі рэпертуар, распрацоўваць сцэнарый.

ПК-18. Арганізоўваць работу творчых калектываў для дасягнення пастаўленых мэт і задач.

ПК-21. Працаваць з юрыдычнай літаратурай і працоўным заканадаўствам, кіравацца нарматыўна-прававымі дакументамі, што звязаны з дзейнасцю ў сферы эстрады.

**Рэпетыцыйна-канцэртная (вытворчая) практыка**

***Акадэмічныя кампетэнцыі:***

АК-5. Быць здольным пароджаць новыя ідэі (валодаць крэатыўнасцю).

АК-6. Валодаць міждысцыплінарным падыходам пры вырашэнні праблем.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

АК-7. Мець навыкі, звязаныя з выкарыстаннем тэхнічных устройстваў, кіраваннем інфармацыяй і работай з камп'ютарам.

АК-8. Валодаць навыкамі вуснай і пісьмовай камунікацыі.

***Сацыяльна-асобасныя кампетэнцыі:***

САК-1. Валодаць якасцямі грамадзянскасці.

САК-2. Быць здольным да сацыяльнага ўзаемадзеяння.

САК-3. Валодаць здольнасцю да міжасобасных камунікацый.

САК-7. Быць здольным асэнсавана ўспрымаць і беражліва адносіцца да гістарычнай, культурнай спадчыны Беларусі і свету, культурных традыцый і рэлігійных поглядаў.

***Прафесійныя кампетэнцыі:***

ПК-1. Удзельнічаць у якасці артыста, прадзюсара эстрадных калектываў (тэатральных, музычных) розных творчых напрамкаў.

ПК-2. Валодаць асновамі распрацоўкі эстрадных відовішчаў, канцэртаў, спектакляў.

ПК-3. Ствараць і выконваць праграмы з featureнахарактарных твораў у розных формах, жанрах і стылях акадэмічнай, джазавай, рок- і поп-музыкі.

ПК-4. Ствараць камп'ютарныя аранжыроўкі музычных твораў у розных формах, жанрах і стылях акадэмічнай, джазавай, рок- і поп-музыкі для музычных калектываў розных творчых кірункаў.

ПК-5. Фарміраваць мастацкі рэпертуар, распрацоўваць сцэнарый.

ПК-6. Рыхтаваць творчыя выступленні мастацкіх калектываў і весці канцэртную работу ў рэгіёне і за яго межамі.

ПК-7. Распрацоўваць і арганізоўваць творчыя праекты.

**Педагагічная (вытворчая) практыка**

***Акадэмічныя кампетэнцыі:***

АК-1. Умець выкарыстоўваць базавыя навукова-тэарэтычныя веды для вырашэння тэарэтычных і практычных задач.

АК-3. Валодаць даследчымі навыкамі.

АК-5. Быць здольным параджаць новыя ідэі (валодаць крэатыўнасцю).

АК-9. Умець вучыцца, самастойна павышаць сваю кваліфікацыю на працягу ўсяго жыцця.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

АК-10. Валодаць метадамі і сродкамі пазнання, навучання, самакантролю для інтэлектуальнага развіцця, павышэння культурнага ўзроўню, прафесійнай кампетэнцыі.

***Сацыяльна-асобасныя кампетэнцыі:***

САК-2. Быць здольным да сацыяльнага ўзаемадзеяння.

САК-3. Валодаць здольнасцю да міжасобасных камунікацый.

***Прафесійныя кампетэнцыі:***

ПК-8. Выкладаць спецыяльныя дысцыпліны, вывучаць перадавы педагагічны і выканальніцкі вопыт, творча карыстацца ім у сваёй педагагічнай дзейнасці.

ПК-9. Працаваць з вучэбнымі планамі і праграмамі, метадычнымі рэкамендацыямі па арганізацыі працэсу навучання і выхавання.

ПК-10. Планаваць працэс навучання і выхавання ў адпаведнасці з распрацаванымі нарматыўнымі дакументамі і дыдактычнымі матэрыяламі.

ПК-11. Улічваць псіхалагічныя асаблівасці навучэнцаў і практыкаваць індывідуальны падыход да вырашэння мэт і задач навучання і выхавання.

ПК-12. Выкарыстоўваць сучасныя методыкі і тэхнічныя сродкі навучання.

ПК-13. Рыхтаваць і ажыццяўляць справаздачныя заняткі па вучэбнай дысцыпліне ў форме акадэмічных канцэртаў, творчых паказаў.

ПК-14. Карыстацца інфармацыйнымі рэсурсамі для азнаямлення з нарматыўнай базай адукацыі і інавацыямі ў навучанні.

ПК-15. Удасканальваць сваё педагагічнае майстэрства.

**Пераддыпломная (вытворчая) практыка**

***Акадэмічныя кампетэнцыі:***

АК-1. Умець выкарыстоўваць базавыя навукова-тэарэтычныя веды для вырашэння тэарэтычных і практычных задач.

АК-5. Быць здольным параджаць новыя ідэі (валодаць крэатыўнасцю).

***Сацыяльна-асобасныя кампетэнцыі:***

САК-2. Быць здольным да сацыяльнага ўзаемадзеяння.

САК-3. Валодаць здольнасцю да міжасобасных камунікацый.

САК-5. Быць здольным да крытыкі і самакрытыкі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

***Прафесійныя кампетэнцыі:***

ПК-1. Удзельнічаць у якасці артыста, прадзюсара эстрадных калектываў (тэатральных, музычных) розных творчых напрамкаў.

ПК-2. Валодаць асновамі распрацоўкі эстрадных відовішчаў, канцэртаў, спектакляў.

ПК-3. Ствараць і выконваць праграмы з рознахарактарных твораў у розных формах, жанрах і стылях акадэмічнай, джазавай, рок- і поп-музыкі.

ПК-4. Ствараць камп'ютарныя аранжыроўкі музычных твораў у розных формах, жанрах і стылях акадэмічнай, джазавай, рок- і поп-музыкі для музычных калектываў розных творчых кірункаў.

ПК-5. Фарміраваць мастацкі рэпертуар, распрацоўваць сцэнарый.

ПК-6. Рыхтаваць творчыя выступленні мастацкіх калектываў і весці канцэртную работу ў рэгіёне і за яго межамі.

ПК-7. Распрацоўваць і арганізоўваць творчыя праекты.

ПК-21. Працаваць з юрыдычнай літаратурай і працоўным заканадаўствам, кіравацца нарматыўна-прававымі дакументамі, што звязаны з дзейнасцю ў сферы эстрады.

ПК-22. Аналізаваць сучасны стан, перспектывы і напрамкі развіцця мастацтва эстрады.

ПК-23. Ужываць новыя інавацыйныя тэхналогіі навучання, мультымедыйныя тэхналогіі, электронныя падручнікі.

ПК-24. Распрацоўваць методыкі навучання па спецыяльных дысцыплінах, вучэбныя праграмы, вучэбна-метадычныя комплексы і іншую вучэбную літаратуру.

*Мэта практыкі* – замацаванне ведаў, атрыманых у працэсе навучання ва ўстанове адукацыі, развіццё прафесійных кампетэнцый.

*Асноўныя задачы практыкі:*

– паглыбіць і замацаваць веды ў рэжысёрскай практыцы;

– выпрацаваць асноўныя навыкі работы ў якасці асістэнта рэжысёра, рэжысёра-пастаноўшчыка ў творчым працэсе ва ўстановах культуры ці ўстановах адукацыі ў галіне культуры;

– падрыхтаваць студэнта да творчага супрацоўніцтва ў складзе рэжысёрска-пастановачнай групы, канцэртнага аддзела;

– сфарміраваць навыкі арганізацыі і ажыццяўлення педагагічнага працэсу ў межах выкладання спецыяльных дысцыплін

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

(рэжысура эстрадных відовішчаў, асновы класічнай рэжысуры і майстэрства акцёра, мастацтва рыторыкі, тэорыя драмы і асновы сцэнарнага майстэрства, сцэнаграфія; выканальніцкае майстэрства, інструментальны ансамбль, пастаноўка эстраднага нумара і г. д.).

У межах усіх відаў практыкі студэнты набываюць вопыт арганізацыйнай, творчай і педагагічнай дзейнасці, знаёмяцца з сучаснымі падыходамі да правядзення відовішчных мерапрыемстваў, авалодваюць перадавымі методыкамі ў галіне рэжысуры эстрады.

Базамі практыкі з'яўляюцца ўстановы культуры і ўстановы адукацыі ў галіне культуры.

Змест практыкі дыферэнцыруецца ў залежнасці ад віду практыкі і прадугледжвае:

– вызначэнне тэрміну і ўмоў праходжання практыкі (з адрывам ці без адрыву ад аўдыторных заняткаў);

– распрацоўку прыкладнага плана правядзення практыкі ў канкрэтных базавых установах;

– удзел студэнтаў у мастацка-творчай дзейнасці ўстановы-базы практыкі;

– парадак падрыхтоўкі і тэрмін абароны вынікаў практыкі.

*Студэнты знаёмяцца з:*

– сучаснымі падыходамі да арганізацыі і правядзення эстрадных спектакляў, відовішчных мерапрыемстваў, святочных дзействаў;

– творчымі кірункамі дзейнасці розных устаноў культуры, калектываў, выканаўцаў;

– перадавым вопытам вядучых спецыялістаў у галіне эстрады;

– тэхналогіяй арганізацыіі педагагічнага працэсу ва ўстановах адукацыі ў галіне культуры і г. д.

Для студэнтаў завочнай формы атрымання адукацыі ўсе віды практыкі арганізоўваюцца ў міжсесіённы перыяд і тэрміны праходжання вызначаюцца графікам адукацыйнага працэсу на кожны навучальны год. Пры арганізацыі практыкі выкарыстоўваюцца інфармацыйна-камунікацыйныя тэхналогіі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ ПРАКТЫКІ

## ВУЧЭБНАЯ (АЗНАЯМЛЕНЧАЯ) ПРАКТЫКА

Вучэбная (азнаямленчая) практыка ўключае наведванне ўстаноў культуры розных тыпаў і кіраўнічых структур сярэдніх і спецыяльных устаноў культуры розных узроўняў. Азнаямленне са зместам і асаблівасцямі педагагічнай работы ва ўстановах культуры рознага тыпу. Азнаямленне з комплексам тэхнічных сродкаў устаноў культуры. Азнаямленне з методыкай правядзення індывідуальных, дробнагрупавых і лекцыйных заняткаў. Наведванне мастацкіх калектываў, майстар-класаў і інш. Апісанне арганізацыйнай структуры базавай установы і сістэмы планавання з пункту гледжання структуры і зместу. Вывучэнне асноўных дакументаў уліку і справаздачнасці базавай установы культуры. Азнаямленне са зместам і асаблівасцямі прадпрымальніцкай дзейнасці ў базавай установе.

Вучэбная (азнаямленчая) практыка студэнтаў праводзіцца ў 3 семестры без адрыву ад аўдыторных заняткаў (1 тыдзень) на працягу семестра.

*Мэта практыкі* – азнаямленне студэнтаў з умовамі работы рэжысёра эстрадных відовішчаў, канцэртнага аддзела, разнастайнасцю мерапрыемстваў, якія праводзяцца на дадзенай базе практыкі, з этапам арганізацыі мерапрыемства (планаванне, складанне арганізацыйнага плана, напісанне сцэнарыя і г. д.), правядзеннем рэпетыцыйнага працэсу і самога мерапрыемства, творчага праекта.

*Задачы практыкі:*

1. Атрымаць пачатковыя веды па арганізацыі, правядзенні эстрадных відовішчаў, канцэртных мерапрыемстваў, набыць уменне аналізаваць іх арганізацыю і правядзенне ва ўмовах назірання за творчым працэсам.

2. Абагульніць асноўныя кірункі дзейнасці, выкарыстанне разнастайных жанраў пры планаванні і правядзенні канцэртных мерапрыемстваў ва ўстановах культуры і ўстановах адукацыі ў сферы культуры.

3. Прапанаваць схему арганізацыі і правядзення рэпетыцыйнага працэсу ва ўвасабленні святочных мерапрыемстваў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

4. Азнаёміцца са зместам дзейнасці канцэртнага аддзела, аддзела маркетынгу.

5. Знаёмства з неабходнай дакументацыяй па арганізацыі гастрольна-канцэртнай дзейнасці.

Практыка прадугледжвае сустрэчы студэнтаў і кіраўніка практыкі з супрацоўнікамі базы практыкі па профілю спецыяльнасці. Практыканты знаёмяцца з дакументацыяй праведзеных мерапрыемстваў (планы культурна-масавых мерапрыемстваў, сцэнарыі, каштарысы), разам з кіраўніком практыкі ад кафедры знаёмяцца з планам правядзення мерапрыемстваў на месяц, наведваюць, па дамоўленасці з мастацкім кіраўніком, зводныя, тэхнічныя і генеральную рэпетыцыі, прысутнічаюць на мерапрыемствах, наведваюць і назіраюць за тэхналогіяй рэпетыцыйнага працэсу і якасцю ўвасаблення мастацкай задумы.

Падчас азнаямленчай практыкі студэнтам неабходна выканаць наступныя заданні, якія складаюць яе асноўны змест:

1. Выявіць спецыфічныя кірункі мастацка-творчай дзейнасці базавай установы, разнастайнасць мерапрыемстваў на аснове азнаямлення з дакументацыяй па арганізацыі і правядзенні культурна-масавых мерапрыемстваў.

2. Скласці графік наведвання рэпетыцый і разбору дзеянняў рэжысёра-пастаноўшчыка на рэпетыцыях; вызначыць кірункі работы.

3. Зрабіць аналіз мерапрыемстваў, на якіх студэнты-практыканты прысутнічалі (дасягненні, недахопы, водгукі гледачоў, рэжысёрскія знаходкі і інш.); прааналізаваць эфектыўнасць работы арганізацыі ў галіне рэкламнай кампаніі (распаўсюджванне білетаў, сувязь з арганізацыямі, выдавецтва афіш).

4. Сабраць звесткі аб калектывах (дзейнасць калектываў, выканаўцы, рэпертуар).

*Заключная дакументацыя вучэбнай (азнаямленчай) практыкі*

Пасля заканчэння азнаямленчай практыкі студэнт-практыкант афармляе індывідуальны дзённік, які адлюстроўвае змест работы студэнта па практыцы, аналіз кірункаў мастацка-творчай дзейнасці базавай установы, дакументацыю па арганізацыі і правядзенні мерапрыемстваў. Пажадана ў дзённіку ўказаць графік наведвання рэпетыцый (з апісаннем іх этапаў, зместам) і мерапрыемстваў (прывесці абагульненне вынікаў рэпеты-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

цыйнай работы, на якой прысутнічаў практыкант). Заканчваецца практыка залікам, на які студэнты прадстаўляюць дзённікі практыкі з дакладным разборам разнастайных жанраў мерапрыемстваў у дадзенай установе. Таксама кожны студэнт прадстаўляе графік наведвання рэпетыцыйнага працэсу і мерапрыемстваў. На канферэнцыі абагульняюцца вынікі азнаямленчай практыкі, робяцца прапановы па яе ўдасканаленні.

Пасля правядзення вынікаў заліку кіраўнік вучэбнай (азнаямленчай) практыкі ад кафедры падводзіць вынікі практыкі, характарызуе і ацэньвае работу студэнта. Вынікі праходжання практыкі абмяркоўваюцца на пасяджэннях кафедры.

## ВЫТВОРЧАЯ (РЭПЕТЫЦЫЙНА-КАНЦЭРТНАЯ) ПРАКТЫКА

У змест вытворчай (рэпетыцыйна-канцэртнай) практыкі ўваходзіць азнаямленне з кірункамі дзейнасці эстрадных калектываў розных творчых напрамкаў; аналіз рэпертуару калектыву: жанры, формы і стылі сцэнічных твораў, а таксама індывідуальна-выканальніцкая манера калектыву; правядзенне аналізу арганізацыйна-творчай работы кіраўніка калектыву; ацэнка эфектыўнасці форм і метадаў работы кіраўніка з калектывам; аналіз методыкі правядзення рэпетыцыйнага працэсу; удзел у рэпетыцыях калектыву ў якасці асістэнта рэжысёра; ацэнка стану метадычнага і тэхнічнага забеспячэння творчага калектыву; удзел у канцэртнай дзейнасці базавага калектыву; выпрацоўка навыкаў рэжысёрскай дзейнасці ва ўстановах культуры; азнаямленне са зместам і асаблівасцямі арганізацыйнай дзейнасці ў базавай установе; удзел у арганізацыі і правядзенні мерапрыемстваў у якасці выканаўцы, рэжысёра.

Вытворчая (рэпетыцыйна-канцэртная) практыка праходзіць у 5 семестры без адрыву ад аўдыторных заняткаў (2 тыдні) на працягу семестра.

*Мэта практыкі* – замацаванне тэарэтычных ведаў, набыццё пачатковых навыкаў арганізацыі і правядзення відовішча, канцэрта, спектакля. Разам з тым вытворчая практыка з'яўляецца формай праверкі творчых здольнасцей студэнта, яго прафесійнай годнасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Студэнты працуюць па індывідуальным плане, што дазваляе кожнаму праявіць творчы патэнцыял.

Практыка для студэнтаў-рэжысёраў складаецца з арганізацыі асобных сцэн, канцэртных нумароў згодна з распрацаваным студэнтамі і кіраўніком ад базы практыкі сцэнарыем відовішча (канцэрта, спектакля, дзейства).

*Задачы практыкі* ва ўмовах рэалізацыі пэўнага творчага праекта:

1. Замацаваць веды, уменні і навыкі распрацоўкі, арганізацыі і правядзення рэпетыцый спектакля, канцэртнай праграмы, набытыя студэнтамі па дысцыпліне «Рэжысура эстрадных відовішчаў»; прымяніць на практыцы тэарэтычныя веды, набытыя студэнтамі па дысцыпліне «Арганізацыя шоу-бізнесу», у арганізацыі піяр-кампаніі творчага праекта, падрыхтоўцы дакументацыі канцэртна-гастрольнай дзейнасці калектыву.

2. Увасобіць у пэўным творчым праекце эстрадныя нумары, падрыхтаваныя ў межах паказаў па спецыяльных дысцыплінах; распрацаваць арганізацыйную і фінансавую дакументацыю (дамовы з артыстамі, заявы на правядзенне масавага мерапрыемства і г. д.), прапановы па рэалізацыі асабістых напрацовак розных відаў творчых праектаў.

3. Набыць пачатковыя навыкі асістэнцка-рэжысёрскай работы па ўвасабленні асобных фрагментаў відовішча і прадзюсарскай дзейнасці ў кірунку арганізацыі відовішчнага мерапрыемства.

Падчас вытворчай практыкі студэнтам неабходна выканаць наступныя заданні, якія адлюстроўваюць яе змест:

1. Скласці і ўвасобіць рэжысёрскую распрацоўку асобных эпізодаў відовішча; даць прапановы асабістага творчага праекта з планам яго рэалізацыі, ажыццяўляць дзейнасць у сферы рэкламы і менеджменту базавай установы.

2. Прымаць удзел у рэпетыцыйным працэсе ў якасці асістэнта рэжысёра, выканаўцы (артыста). Прыстасаваць накоплены тэарэтычны і практычны матэрыял да пэўнага відовішча з улікам узросту глядацкай аўдыторыі; ажыццяўляць аналіз рэкламна-інфармацыйнай дзейнасці ўстановы, спажывецкага рынку, уносіць прапановы па ўдасканаленні маркетынгавай стратэгіі ўстановы.

3. Распрацаваць сцэнарый відовішча ці план творчага праекта.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

4. Сабраць звесткі аб удзельніках-калектывах і іх рэпертуары.

*Заключная дакументацыя вытворчай (рэпетыцыйна-канцэртнай) практыкі*

Пасля заканчэння практыкі студэнт афармляе сцэнарый відовішча, у якім ён прымаў удзел падчас праходжання практыкі, прадстаўляе дзённік практыкі і пісьмовую справаздачу аб выкананні заданняў практыкі. Заканчваецца практыка дыферэнцыраваным залікам, на які студэнты прадстаўляюць дзённікі практыкі, аналіз відовішчаў, справаздачу, у якой абагульняюць вынікі практыкі і робяць прапановы па ўдасканаленні яе перспектыўных кірункаў.

Пасля падвядзення вынікаў дыферэнцыраванага заліку кіраўнік ад кафедры аналізуе дзейнасць кожнага практыканта і выстаўляе адзнаку за ўдзел у рэпетыцыйна-канцэртнай практыцы.

## ВЫТВОРЧАЯ (ПЕДАГАГІЧНАЯ) ПРАКТЫКА

Вытворчая (педагагічная) практыка ўключае наведванне ўрокаў выкладчыкаў малодшых і сярэдніх установаў і правядзенне самастойных заняткаў па спецдысцыплінах. Аналіз існуючых праграм па спецдысцыплінах для вучняў I–XI класаў сярэдняй школы. Распрацоўка канспектаў, авалоданне методыкай арганізацыі правядзення ўрокаў і выхаваўчай работы ў навучальнай установе. Распрацоўка плана-канспекта і правядзенне аднаго пазакласнага мерапрыемства з удзелам вучняў. Правядзенне адкрытага ўрока з вучнем у прысутнасці камісіі. Удзел у арганізацыі і правядзенні мерапрыемстваў.

Вытворчая (педагагічная) практыка студэнтаў кафедры рэжысуры эстрады арганізуецца на 3 курсе (2 тыдні) без адрыву ад заняткаў на працягу года. Педагагічная практыка з’яўляецца вынікам якасці навучання студэнтаў па псіхолага-педагагічных дысцыплінах, а таксама дысцыплінах спецыяльнага цыкла. Для ажыццяўлення педагагічнай практыкі вызначаюцца два кіраўніка: адзін – ад кафедры рэжысуры эстрады, другі – ад кафедры псіхалогіі і педагогікі, якія ў адпаведнасці з праграмай складаюць план праходжання практыкі, індывідуальныя заданні для студэнтаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Педагагічная практыка накіравана на засваенне студэнтамі педагагічных працэсаў і з’яў у навучальных установах, фарміраванне творчых здольнасцей і якасці асобы будучага настаўніка спецыяльных дысцыплін. Базамі практыкі з’яўляюцца ўстановы адукацыі.

*Мэта педагагічнай практыкі* – авалоданне практычнымі навыкамі і ўменнямі, а таксама тэхналогіяй выкладання спецыяльных дысцыплін (рэжысура эстрадных відовішчаў, асновы класічнай рэжысуры і акцёрскага майстэрства, тэорыя драмы і асновы сцэнарнага майстэрства, сцэнаграфія, пастаноўка эстраднага нумара).

*Задачы педагагічнай практыкі:*

1. Паглыбленне і замацаванне тэарэтычных ведаў па дысцыплінах псіхолага-педагагічнага цыкла, іх ужыванне і вырашэнне прыкладных педагагічных і творчых задач.
2. Фарміраванне і развіццё практычных навыкаў выкладання дысцыплін кірунку спецыяльнасці.
3. Апрабацыя разнастайных метадаў і сродкаў навучання.
4. Выкарыстанне методыкі падрыхтоўкі ўрока, выкладання вучэбнага матэрыялу ў залежнасці ад узросту навучэнцаў (вызначэнне мэты і зместу ўрока, выбар метадаў і прыёмаў дзеля дасягнення мэты ў залежнасці ад тыпу ўрока, складанне плана і канспекта ўрока, падбор і падрыхтоўка наглядных і тэхнічных сродкаў і інш.).
5. Засваенне навыкаў самастойнага вядзення практычных і індывідуальных заняткаў па спецыяльных дысцыплінах.
6. Знаёмства з арганізацыяй вучэбнай і выхаваўчай работы ў творчых калектывах.

Да справаздачы па педагагічнай практыцы студэнты прыкладаюць індывідуальныя планы работы, якія адлюстроўваюць яе змест. У індывідуальны план могуць быць уключаны наступныя віды работ:

– планаванне заняткаў розных тыпаў (лекцыі, практычныя, індывідуальныя);
– рапрацоўка плана-канспекта ўрока;
– азнаямленне з методыкай ацэнкі і кантролю ведаў;
– распрацоўка і правядзенне мерапрыемства (спектакля, канцэрта);

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– напісанне псіхолага-педагагічнай характарыстыкі на асобнага вучня, вучэбны ці творчы калектыў;

– падрыхтоўка пісьмовага псіхолага-педагагічнага аналізу індывідуальных і групавых заняткаў;

– вызначэнне эфектыўнасці ўрокаў і творчых мерапрыемстваў, аналіз педагагічнай дзейнасці.

Планы работы павінны адпавядаць мэтам і задачам вучэбна-выхаваўчага працэсу і быць накіраваны на канкрэтныя ўмовы і магчымасці базы педагагічнай практыкі.

*Падчас правядзення практыкі кожны студэнт абавязаны:*

1. Наведаць не менш чым за дваццаць заняткаў па розных дысцыплінах, якія праводзяць выкладчыкі базавай установы.

2. Правесці кантрольны самастойны занятак з навучэнцамі па спецыяльнай дысцыпліне (1 гадзіна).

3. Прыняць удзел у арганізацыі, падрыхтоўцы і правядзенні мерапрыемства, відовішча ў базавай установе.

У апошні тыдзень практыкі студэнты працягваюць вучэбную і выхаваўчую работу і афармляюць справаздачную дакументацыю. Змест і якасць афармлення дакументацыі ўлічваецца пры вывядзенні выніковай адзнакі за педагагічную практыку.

*Заключная дакументацыя педагагічнай практыкі*

Па заканчэнні практыкі праводзіцца дыферэнцыраваны залік, на які студэнт-практыкант прадстаўляе наступныя дакументы:

1. Дзённік педагагічнай практыкі з указаннем відаў работ, планамі самастойна праведзеных урокаў за подпісамі выкладчыкаў базавай установы.

2. Псіхолага-педагагічную характарыстыку вучня (удзельніка мастацкага калектыву) ці псіхолага-педагагічную характарыстыку дзіцячага мастацкага калектыву базы практыкі.

3. Водгук адміністрацыі навучальнай установы на арганізаванае і праведзенае студэнтам пазакласнае мерапрыемства.

4. Псіхолага-педагагічны аналіз урокаў па дысцыплінах, праведзеных і наведаных падчас педагагічнай практыкі.

5. Характарыстыку на практыканта ад кіраўніка практыкі ад установы, дзе адбывалася педагагічная практыка, з ацэнкай якасці педагагічнай падрыхтоўкі студэнта. Кіраўнікі практыкі ад кафедр выстаўляюць адзнаку аб здачы дыферэнцыраванага заліку.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ПЕРАДДЫПЛОМНАЯ ПРАКТЫКА

Пераддыпломная практыка з’яўляецца заключным этапам прафесійнай падрыхтоўкі спецыяліста да практычнай дзейнасці.

*Мэта практыкі* – завяршэнне фарміравання прафесійных і арганізацыйных уменняў праз укараняльную дзейнасць студэнта над практычнай часткай сваёй творчай работы.

*Асноўная задача практыкі:* выпрацоўка навыкаў інавацыйнай дзейнасці ў сферах культуры і мастацтва; замацаванне ўсяго комплексу ведаў па дысцыплінах спецыяльнасці ў адпаведнасці з абраным кірункам. Змест практыкі кожнага студэнта вызначаецца індывідуальна. Вынікам практыкі з’яўляецца падрыхтоўка эстрадных кампазіцый, праектаў, падрыхтоўка музычнай, вакальнай, інструментальнай праграмы творчага праекта відовішча.

Пераддыпломная практыка студэнтаў 4 курса праводзіцца ў 7 і 8 семестрах на працягу 4 тыдняў, па 2 тыдні ў кожным семестры. Пераддыпломная практыка з’яўляецца адным з галоўных этапаў у навучанні будучага рэжысёра эстрады.

*Мэта пераддыпломнай практыкі* – самастойная дыпломная пастаноўка відовішча, рэалізацыя творчага праекта. Падчас практыкі студэнты паказваюць узровень ведаў, атрыманых па спецыяльных дысцыплінах, а таксама дэманструюць творчы патэнцыял і прафесійную прыгоднасць.

Пераддыпломная практыка праводзіцца кожным студэнтам па асабістым плане, распрацаваным разам з кіраўніком практыкі ад кафедры рэжысуры эстрады і кіраўніком ад базы практыкі. Заканчваецца практыка пастаноўкай відовішчнага мерапрыемства, увасабленнем творчага праекта.

Пераддыпломная практыка прадугледжвае сістэму арганізацыйных мерапрыемстваў і творчых задач:

– сабраць дакументальны і гістарычны матэрыял па зацверджанай тэме мерапрыемства;

– азнаёміцца з ландшафтнымі ці архітэктурнымі асаблівасцямі будучага месца мерапрыемства;

– прагледзець рэпертуар мастацкіх, тэхнічных, спартыўных калектываў, якія з’яўляюцца магчымымі ўдзельнікамі свята, дзеі;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– удакладніць сцэнарый дыпломнай работы і рэжысёрскі праект свята; матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне, арганізацыйна-фінансавую дакументацыю мерапрыемства і каштарысныя разлікі;

– каардынаваць дзеянні ўсіх груп і адказных асоб, якія будуць задзейнічаны ў падрыхтоўцы і правядзенні дыпломнага свята;

– наладзіць сувязі з творчымі калектывамі, адміністрацыйнымі работнікамі ўстаноў культуры;

– зрабіць відэазапіс мерапрыемства.

У ходзе пераддыпломнай практыкі студэнту належыць выканаць наступныя заданні:

1. Удакладніць з мясцовым кіраўніцтвам горада, установы тэрмін і месца правядзення мерапрыемства.

2. Зацвердзіць у кіруючых і фінансавых установах каштарысна-фінансавую дакументацыю, неабходную для пачатку работы па падрыхтоўцы тэхнічнага і творчага забеспячэння прапануемай пастаноўкі.

3. Наладзіць сувязі са спонсарамі ці групай спонсараў мерапрыемства.

4. Зацвердзіць у мясцовым кіраўніцтве кандыдатуру дырэктара мерапрыемства.

5. Абмеркаваць і зацвердзіць з кіраўніцтвам рабочы і пастановачны планы мерапрыемства.

6. Зацвердзіць адміністрацыйна-творчую пастановачную групу мерапрыемства.

7. Правесці пасяджэнне рэжысёрска-пастановачнай групы, зацвердзіць адказных асоб па ўсіх напрамках падрыхтоўчага перыяду і асноўныя тэрміны творчай і тэхнічнай гатоўнасці.

8. Зацвердзіць з кіраўнікамі ўсіх творчых груп графік рэпетыцый (зводныя, генеральная).

9. Наладзіць рэгулярныя сустрэчы з кіраўнікамі мастацкіх, спартыўных, тэхнічных і іншых калектываў.

10. Уносіць карэктывы ў графікі рэпетыцый і тэрміны падрыхтоўкі тэхнічнага абсталявання.

11. Праводзіць пасяджэнне групы падрыхтоўкі мерапрыемства з інфармаваннем прадстаўнікоў выканаўчай улады згодна з тэрмінам, зацверджаным у рабочым плане.

12. Вызначыць з кіраўніцтвам камісію ад базы практыкі.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

13. Пастаянна абмяркоўваць з кіраўнікамі практыкі выкананне ўсіх работ, уключаных у індывідуальны план практыканта.

*Заключная дакументацыя пераддыпломнай практыкі*

Пасля заканчэння пераддыпломнай практыкі студэнт-практыкант афармляе наступную дакументацыю:

1. Сцэнарый і рэжысёрскі праект мерапрыемства.
2. Характарыстыку на студэнта-практыканта за час практыкі ад кіраўніцтва базавай установы.
3. Пісьмовую справаздачу аб асноўных этапах практыкі з прывядзеннем усіх заданняў.
4. Рабочы план, які зацверджаны базавай установай.
5. Друкаваную прадукцыю, фота-, відэаматэрыялы і іншую інфармацыю аб мерапрыемстве.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

*Падвядзенне вынікаў практыкі*

Па заканчэнні практыкі студэнт афармляе разгорнутую пісьмовую справаздачу, у якой утрымліваюцца звесткі аб выкананай рабоце за перыяд праходжання практыкі, і здае кіраўніку практыкі ад кафедры дзённік. Студэнт-практыкант абараняе справаздачу перад прызначаным кіраўніком ад кафедры і атрымлівае адзнаку, якая выстаўляецца кіраўніком у экзаменацыйную ведамасць і заліковую кніжку студэнта. Студэнт, які не выканаў праграму практыкі, атрымаў нездавальняючую адзнаку ці быў хворы на момант праходжання практыкі, праходзіць яе паўторна ў перыяд студэнцкіх канікул або пасля заняткаў (па дамоўленасці з базавай арганізацыяй).

Агульная справаздача кіраўніка практыкі ад кафедры складаецца па выніках справаздач студэнтаў, абмяркоўваецца і зацвярджаецца на пасяджэнні кафедры. На працягу тыдня пасля пасяджэння кафедры падаецца выпіска з пратакола кіраўніку практыкі ад універсітэта, а адказнаму па практыцы ад факультэта музычнага мастацтва – справаздача аб выніках практыкі, якая абмяркоўваецца на савеце факультэта.

*Пісьмовая індывідуальная справаздача* аб выніках праходжання практыкі павінна адпавядаць праграме практыкі і ўтрымліваць кароткае апісанне дзейнасці базы практыкі, апісанне праведзенай практыкантам працы, вывады і прапановы аб ходзе праходжання практыкі. У справаздачы па практыцы павінны быць адлюстраваны ўсе віды работ, выкананыя ў адпаведнасці з індывідуальным заданнем і індывідуальным планам практыкі.

Справаздача аб праходжанні практыкі павінна быць аформлена на стандартных аркушах фармату А4 (210х297 мм) з аднаго боку. Тэкст друкуецца праз інтэрвал 1,5 шрыфтам Times New Roman 13/14 пунктаў. Размеры палёў: злева – 30 мм, справа – 15 мм, уверсе – 20 мм, знізу – 20 мм. Абзацны водступ – 10 мм. Тэкст абавязкова выраўніваецца па шырыне. Нумарацыя старонак справаздачы павінна быць бесперапыннай. Табліцы, якія даюцца ў справаздачы, нумаруюцца паслядоўна. Дадаткі таксама нумаруюцца. На ўсе дадаткі ў асноўным тэксце справаздачы абавязкова прыводзяцца спасылкі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Справаздача падпісваецца практыкантам.

Справаздача, якая складаецца на аснове канкрэтнага фактычнага матэрыялу і суправаджаецца крытычным аналізам, павінна ўтрымліваць:

– тытульны ліст (дадатак 1);

– змест, у якім павінны быць пералічаны ўсе раздзелы справаздачы і ўказаны нумары старонак;

– уводзіны;

– асноўную частку;

– заключэнне;

– дадаткі.

*Ва ўводзінах* указваюцца мэта, месца, дата пачатку і працягласць практыкі; пералік выкананых у працэсе практыкі работ і заданняў.

*Асноўная частка* змяшчае апісанне практычных задач, што былі вырашаны ў працэсе праходжання практыкі; апісанне арганізацыі індывідуальнай работы; вынікі аналізу заняткаў, праведзеных выкладчыкамі і практыкантамі.

*Заключэнне* ўключае апісанне ведаў і ўменняў, набытых на практыцы; прапановы па ўдасканаленні арганізацыі работы.

У канцы праходжання практыкі студэнт даводзіць да ведама кіраўніка практыкі ад кафедры асноўныя палажэнні і вывады, зробленыя ім па выніках праходжання практыкі. Кіраўнік практыкі ад кафедры дае пісьмовую характарыстыку (водгук) аб рабоце практыканта ў перыяд практыкі.

Справаздачныя дакументы па практыцы прадстаўляюцца для кантролю не пазней за пяць дзён пасля заканчэння практыкі (уключаючы выхадныя і святочныя дні) кіраўніку практыкі і пасля абароны здаюцца на кафедру. Усе дакументы павінны быць надрукаваныя і прадстаўлены ў асобнай папцы з тытульным лістом.

Пісьмовая індывідуальная справаздача аб праходжанні практыкі і дзённік, аформленыя з парушэннем патрабаванняў праграмы, не прымаюцца, і, як вынік, студэнт не дапускаецца да абароны практыкі і не атэстоўваецца.

*Арганізацыя кіраўніцтва практыкай*

Прадстаўнікі прафесарска-выкладчыцкага складу кафедры, адказныя за правядзенне таго ці іншага віду практыкі, звязваюцца з кіраўнікамі баз практыкі, уносяць прапановы ў



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вучэбны аддзел па заключэнні дамоў з новымі базамі практыкі, размяркоўваюць студэнтаў па адпаведных базах.

Вучэбна-метадычнае забеспячэнне практыкі здзяйсняюць кіраўнікі практыкі ад кафедры рэжысуры эстрады, якія забяспечваюць выкананне праграм практыкі і якасць яе правядзення.

*Абавязкі студэнта-практыканта:*

Скласці індывідуальны графік праходжання практыкі.

Адлюстроўваць у дзённіку выкананне плана практыкі.

Выконваць запланаваныя заданні, фіксаваць змест і вынікі работы за кожны дзень практыкі.

Падпарадкоўвацца правілам унутранага распарадку базы практыкі.

Прымаць актыўны ўдзел у творчым жыцці калектыву базавай арганізацыі, яго мастацкай дзейнасці.

## Метадычныя рэкамендацыі па праходжанні вучэбнай (азнаямленчай) практыкі

1. На базу практыкі студэнты прыбываюць разам з кіраўніком ад кафедры і знаёмяцца з кіраўнікамі практыкі ад базавай установы.
2. Пры сустрэчы практыкантаў з кіраўнікамі практыкі ад базавай установы дэталёва разглядаюцца аспекты дзейнасці практыкантаў у залежнасці ад відаў практыкі: наведванне рэпетыцый, мерапрыемстваў.
3. Студэнты знаёмяцца з работай творчых калектываў і выканаўцаў дадзенай установы, з іх рэпертуарам.
4. Па завяршэнні студэнт-практыкант аналізуе правядзенне рэпетыцый у базавай установе, вынікі пастановачнай, арганізацыйнай работы рэжысёра, пастановачнай групы мерапрыемства, уносіць пэўныя прапановы па ўдасканаленні работы.

## Метадычныя рэкамендацыі па праходжанні вытворчай (рэпетыцыйна-канцэртнай) практыкі

1. На базу практыкі студэнты прыбываюць з пэўнымі распрацоўкамі творчых праектаў – сцэнарыем мерапрыемства, эпізодаў відовішча.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2. Пры сустрэчы з кіраўніком практыкі ад базавай установы дэталёва ўдакладняюцца аспекты дзейнасці практыканта ў мерапрыемстве (канцэрце, спектаклі, святочным дзеянні і г. д.).

3. Сумесна з кіраўніком практыкі студэнты прымаюць удзел у абмеркаванні арганізацыйных пытанняў рэжысёрска-пастановачнай групы наконт правядзення мерапрыемства, прынцыпаў прасторавага вырашэння, музычна-шумавога, мастацкага афармлення.

4. Пры падрыхтоўцы мерапрыемства праводзяць рэпетыцыі эпізода (часткі) мерапрыемства (канцэрта, спектакля, дзеі), выконваюць асістэнцка-рэжысёрскія абавязкі з абавязковым фіксаваннем усіх заданняў галоўнага рэжысёра.

5. Пасля заканчэння мерапрыемства практыканты збіраюць інфармацыю аб глядацкіх уражаннях, робяць асабісты аналіз відовішча.

6. Падчас праходжання практыкі студэнты занатоўваюць усе аспекты сваёй дзейнасці ў базавай арганізацыі, абагульняюць вынікі і выказваюць прапановы па ўдасканаленні работы.

## План псіхолага-педагагічнай характарыстыкі вучэбна-творчага калектыву

1. Агульныя звесткі пра калектыў і гісторыю яго стварэння (колькасць удзельнікаў, узроставы склад, гісторыя ўзнікнення і кіраўнікі і г. д.).

2. Кіраўніцтва і арганізацыя творчага калектыву (актыў калектыву і яго работа, характарыстыка актывістаў (самастойнасць, ініцыятыўнасць, аўтарытэт у калектыве, арганізатарскія здольнасці).

3. Узаемаадносіны ўнутры калектыву.

4. Характарыстыка вучэбна-творчай дзейнасці калектыву (узровень падрыхтоўкі, эфектыўнасць засваення матэрыялу, наяўнасць кантролю, узаемадапамога).

5. Стан дысцыпліны ў калектыве (дысцыпліна на рэпетыцыях і мерапрыемствах, асноўныя метады барацьбы з парушальнікамі дысцыпліны).

6. Узаемаадносіны калектыву з кіраўніком (стыль і метады работы, аўтарытэт сярод артыстаў).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Метадычныя рэкамендацыі па праходжанні пераддыпломнай практыкі

1. Па прыбыцці на базу пераддыпломнай практыкі студэнт-практыкант сустракаецца з кіраўніком (мастацкім кіраўніком, галоўным рэжысёрам) базавай установы і наладжвае творчыя і адміністрацыйныя сувязі, удакладняе акалічнасці будучай работы.

2. Разам з кіраўніком пераддыпломнай практыкі (ад кафедры ці базавай установы) вырашаюцца магчымасці па падрыхтоўцы відовішчнага мерапрыемства (колькасць задзейнічаных калектываў, выканаўцаў, афішы, праграмы і г. д.).

3. У час падрыхтоўчага перыяду кіраўнік практыкі ад кафедры аказвае неабходную практычную дапамогу.

4. Дыпломную работу прымае камісія, зацверджаная на пасяджэнні кафедры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ЛІТАРАТУРА

*Асноўная*


*1.* Арт-менеджмент как вид управленческой деятельности : сб. ст. / под ред. С. Б. Мойсейчук [и др.]. – Минск : Белорус. гос. ун-т культуры и искусств, 2011. – 156 с.

*2. Григорьев, В. Ю.* Самостоятельная работа по специальности : принципы и методы / В. Ю. Григорьев. – М. : Музыка, 1988. – 120 с.

*3. Григорьева, Е. И.* Современные технологии социально-культурной деятельности : учеб. пособие / Е. И. Григорьева. – Тамбов : Изд-во ТГУ им. Г. Р. Державина, 2002. – 504 с.

*4. Жаркова, Л. С.* Деятельность учреждений культуры : учеб. пособие / Л. С. Жаркова. – М. : МГУКИ, 2003. – 233 с.

*5. Киселева, Т. Г.* Социально-культурная деятельность : учебник / Т. Г. Киселева, Ю. Д. Красильников. – М. : МГУКИ, 2004. – 539 с.

*6. Назайкинский, Е. М.* О психологии музыкального восприятия / Е. М. Назайкинский. – М. : Музыка, 1972. – 384 с.

*7. Новикова, Г. Н.* Технологии арт-менеджмента : учеб. пособие / Г. Н. Новикова. – М. : МГУКИ, 2006. – 178 с.

*8.* Психология одаренности детей и подростков / под ред. Н. С. Лейтес. – М., 1996.

*9. Черняк, Ю. М.* Режиссура праздников и зрелищ : учеб. пособие / Ю. М. Черняк. – Минск : ТетраСистемс, 2004. – 221 с.

*8. Чижиков, В. М.* Введение в социокультурный менеджмент : учеб. пособие / В. М. Чижиков, В. В. Чижиков. – М. : МГУКИ, 2003. – 382 с.


*Дадатковая*


*1. Бараева, Е. И.* Педагогическая практика : учеб.-метод. пособие / Е. И. Бараева, М. В. Ершова, С. Н. Маковчик. – Минск : РИВШ, 2007. – 99 с.

*2. Жук, О. Л.* Педагогическая подготовка студентов как средство личностно-профессионального развития / О. Л. Жук // Весн. БДУ. Серыя 4, Філалогія, журналістыка, педагогіка. – 2011. – С. 114–120.

*3. Иванова, О. А.* Педагогическая практика студентов как средство развития субъективности личности / О. А. Иванова // Весн. Брэсцкага ўніверсітэта. Серыя гуманітарных і грамадскіх навук. – 2008. – № 4. – С. 108–112.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ДАДАТКІ

*Дадатак 1*

## Тытульны ліст справаздачы па практыцы

Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»
Факультэт музычнага мастацтва
Кафедра рэжысуры эстрады

**СПРАВАЗДАЧА**

па ______________________________________________практыцы
(від практыкі)

Выканаў:

________________________
(прозвішча, імя, імя па бацьку)

____________________________
(курс, № групы)

Мінск
БДУКМ
20__

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Дадатак 2*

## Крытэрыі ацэнкі вынікаў дыферэнцыраванага заліку

| Балы | Паказчыкі ацэнкі |
|---|---|
| 1 (адзін) | Праграма практыкі не выканана, наведванне базы практыкі ажыццяўлялася не ў адпаведнасці з устаноўленым графікам |
| 2 (два) | Праграма практыкі не выканана. Поўная пасіўнасць падчас праходжання практыкі |
| 3 (тры) | Праграма практыкі выканана не ў поўным аб'ёме. Недастатковы аб'ём ведаў і кампетэнцый; веданне тэрмінаў і паняццяў абмяжоўваецца іх названнем, без здавальняючага разумення. Пастаўленыя задачы выконваюцца фармальна. Пасіўны ў працэсе праходжання практыкі |
| 4 (чатыры) | Праграма практыкі выканана не ў поўным аб'ёме. Пастаянна мае патрэбу ў карэкцыі і падтрымцы з боку кіраўніка практыкі. Няправільна выкарыстоўвае навыкі, атрыманыя пры засваенні спецыяльных дысцыплін. Фармальны ўдзел у дзейнасці базавай установы |
| 5 (пяць) | Праграма практыкі выканана ў поўным аб'ёме. Здольнасць ужываць тэарэтычныя веды, няўпэўненасць пры ўвасабленні на практыцы. Складанасць у праяўленні ініцыятывы |
| 6 (шэсць) | Праграма практыкі выканана ў поўным аб'ёме. Здольнасць ужываць тэарэтычныя веды і ўвасабляць іх на практыцы. У перыяд праходжання практыкі не праяўляў пэўнай ініцыятывы |
| 7 (сем) | Праграма практыкі выканана ў поўным аб'ёме. Здольнасць ужываць тэарэтычныя веды і ўвасабляць іх на практыцы. Сфарміравана патрэба ў самастойнай творчай працы. Малаініцыятыўны |
| 8 (восем) | Праграма практыкі выканана ў поўным аб'ёме. Здольнасць ужываць тэарэтычныя веды і ўвасабляць іх на практыцы. Актыўная дзейнасць у калектыўнай працы, ініцыятыўнасць |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | |
|---|---|
| 9 (дзевяць) | Праграма практыкі выканана ў поўным аб'ёме. Выкарыстанне спецыяльнай тэрміналогіі для аналізу практычных сітуацый. Ужыванне эфектыўных метадаў у выкананні пастаўленых задач. Актыўная дзейнасць, ініцыятыўнасць падчас праходжання практыкі |
| 10 (дзесяць) | Поўныя і сістэматызаваныя веды па ўсіх пастаўленых пытаннях у аб'ёме праграмы, дакладнае выкарыстанне спецыяльнай тэрміналогіі, выкананне звышзапланаваных заданняў і набыццё новых прапаноў ад базавай установы па рэалізацыі пэўных праектаў. Дэманстраванне дадатковага матэрыялу (сцэнарый, звесткі ў СМІ аб праведзеным мерапрыемстве, копіі дамоў), здольнасць да навуковага асэнсавання вынікаў практыкі, актыўная грамадская дзейнасць у базавай установе |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ЗМЕСТ

**Тлумачальная запіска** ……………………..………… 3

**Змест практыкі** ……………………………...……… 9

**Інфармацыйна-метадычная частка** ………..……….. 19

**Спіс літаратуры** ………………………..………… 24

**Дадаткі**

*Дадатак 1.* Тытульны ліст справаздачы па практыцы 25

*Дадатак 2*. Крытэрыі ацэнкі вынікаў дыферэнцыраванага заліку …………………………………………. 26

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

# ПРАГРАМА
# ВУЧЭБНАЙ І ВЫТВОРЧАЙ ПРАКТЫКІ

***Для спецыяльнасці***
*1-17 03 01 Мастацтва эстрады (па напрамках),*
***напрамку спецыяльнасці***
*1-17 03 01-04 Мастацтва эстрады (рэжысура)*


Карэктар В. Б. Кудласевіч
Тэхнічны рэдактар Л. М. Мельнік

Падпісана ў друк 2018. Фармат 60х84 $^{1}/_{16}$.
Папера офісная. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 1,69. Ул.-выд. арк. 1,06. Тыраж экз. Заказ .

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/177 ад 12.02.2014.
ЛП № 02330/456 ад 23.01.2014.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.




РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ